View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 476 (091)"1991/2010"

# КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСІ : ТРАНСФАРМАЦЫЯ МЭТ І ЗАДАЧ (1991–2010 гг.)

**Д.А. Крывашэй[1], Л.А. Білінская[2]**
[1]Інстытут гісторыі НАН Беларусі, norm@tut.by
[2]Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, larisa_bilin@mail.ru

Полесгу

На падставе аналізу заканадаўчых актаў, праграм сацыяльна–эканамічнага развіцця і галіновых праграм, існаваўшых у акрэслены перыяд мы паспрабавалі прасачыць змены мэт і задач дзяржаўнай культурнай палітыкі ў Беларусі.

Першым заканадаўчым актам, які вызначаў агульныя контуры дзяржаўнай культурнай палітыкі ў перыяд рэфармавання эканомікі, быў Закон "Аб культуры" (1991 г.), прыняты 4 чэрвеня 1991 г. Ён вызначыў наступныя мэты культурнай палітыкі: адраджэнне і развіццё беларускай нацыянальнай культуры і культур нацыянальных супольнасцей Беларусі; фарміраванне культурнага асяроддзя, маральных пачаткаў, эстэтычных поглядаў і густаў народу і далучэнне яго да мастацкай творчасці, да гуманітарных каштоўнасцей культуры.

Закон быў накіраваны сярод іншага на "здзяйсненне прынцыпаў ідэалагічнай і палітычнай незалежнасці культуры ад грамадска – палітычных структур, стварэнне прававых умоў для свабоднага самаразвіцця культурных працэсаў, забеспячэнне матэрыяльных і фінансавых гарантый развіцця культуры" а таксама "сацыяльную абарону работнікаў культуры ва ўмовах рынкавых адносін".

Для дасягнення гэтых мэтаў ставілася задачы: стварэнне, захаванне, распаўсюджанне і папулярызацыя твораў матэрыяльнай і духоўнай культуры; захаванне і перадача культурных традыцый; ахова гістарычных і культурных каштоўнасцей.

Асобны артыкул закона вызначыў матэрыяльна–фінансавыя прыярытэты ў галіне развіцця культуры: адраджэнне, захаванне, развіццё і распаўсюджанне беларускай нацыянальнай культуры; стварэнне і папулярызацыя твораў мастацтва і літаратуры для дзяцей, іх эстэтычнай адукацыі і выхаванню; папулярызацыя класічных твораў айчыннага і сусветнага мастацтва і лепшых узораў сучаснай культуры; забеспячэнне развіцця культуры ў сельскай мясцовасці, пашырэнне культурнай інфраструктуры вёскі.

У 2004 г. Закон аб культуры быў прыняты ў новай рэдакцыі. У ім з'явіўся дзесяты артыкул, у частцы 2 якога былі пералічаны мэты дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Часткова яны паўтарылі палажэнні рэдакцыі 1991 г. (гарантыя свабоды мастацкай творчасці і творчай дзейнасці; сацыяльная абарона работнікаў культуры і творчых работнікаў; абарона грамадскай маралі, сцвярджэнне гуманістычных ідэй і высокіх маральных пачаткаў у грамадскім жыцці, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя). Побач з гэтым з'явіліся і новыя: забеспячэнне і абарона канстытуцыйнага права кожнага на ўдзел у культурным жыцці; садзейнічанне захаванню, развіццю і распаўсюджванню культуры на карысць інтарэсаў чалавека і грамадства.

Што тычыцца прыярытэтных напрамкаў, то яны засталіся без істотных зменаў. Калі раней стаяла задача захавання, развіцця і распаўсюджання беларускай нацыянальнай культуры, то цяпер у змест сказа дадалося "і мовы". Калі раней ставілася задача стварэння і папулярызацыі

твораў мастацтва і літаратуры толькі для дзяцей, то цяпер і для моладзі. У новай рэдакцыі знікла палажэнне аб пашырэнні культурнай інфраструктуры вёскі.

Сацыяльна–эканамічныя пераўтварэнні істотна паўплывалі на практыку рэалізацыі культурнай палітыкі. У лютым 1992 г. была прынятая галіновая Праграма дзеянняў па пераадоленню эканамічнага крызісу ў культуры на 1993–1994 гг. Асноўная задача дзяржаўнай культурнай палітыкі ў гэты перыяд бачылася ў захаванні культурнага патэнцыялу нацыі і кантролі над зменамі, якія адбываліся ў сферы культуры.

У канцы 1990–х гадоў роля дзяржавы ў рэгуляванні развіцця працэсаў, якія адбывалі ў сферы культуры, стала больш заўважнай. У Асноўных напрамках сацыяльна–эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2010 г., прынятых у 2000 г., прадугледжвалася ў акрэслены перыяд закласці асновы фарміравання новага постіндустрыяльнага грамадства і развіваць механізм дзеяння *сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі*. Як важнейшая задача вызначалася інтэнсіўнае развіццё турысцкай інфраструктуры. Ставілася задача шырэй уцягваць гісторыка–культурныя каштоўнасці краіны ў індустрыю турысцкага бізнесу. У якасці адной з асноўных мэтаў дзяржаўнай палітыкі, як і ў Законе “Аб культуры”, называлася адраджэнне і развіццё нацыянальнай культуры. Пры гэтым акрэсліваліся і першачарговыя задачы: захаванне дзейнічаючай сеткі ўстаноў культуры і якаснае яе развіццё; умацаванне і абнаўленне матэрыяльна–тэхнічнай базы; забеспячэнне разнастайнасці культурнага жыцця і даступнасці паслуг устаноў культуры для ўсіх слаёў грамадства; істотнае павышэнне узроўню культурнага абслугоўвання; укараненне новых мадэляў і тыпаў устаноў культуры.

Пералічаныя мэты і задачы (за выключэннем двух апошніх, якія тычацца павышэння ўзроўню культурнага абслугоўвання і ўкаранення новых мадэляў і тыпаў устаноў культуры) увайшлі ў Праграму сацыяльна–эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг. Задача “адраджэння нацыянальнай культуры” ў гэтым дакуменце вызначана больш глыбока: “наданне ёй [нацыянальнай культуры – аўт.], як аднаму з важнейшых кампанентаў духоўнага жыцця грамадства, прыярытэтнага напрамку ў сацыяльна–эканамічным жыцці краіны”. Прадугледжвалася павысіць уплыў культуры на ўсе сферы грамадскага жыцця, станаўленне дзяржаўнасці, фарміраванне спрыяльнага жыццёвага асяроддзя нацыі, умацаванне міжнароднага аўтарытэта Беларусі.

Асноўныя напрамкі нацыянальнай культурнай палітыкі і прыярытэты развіцця галіны вызначаны дзяржаўнай праграмай “Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.”: захаванне фальклору; падтрымка тэатраў і кінематаграфіі; развіццё прафесійнага мастацтва; інфарматызацыя сферы культуры.

Комплекс мер па вядучых напрамках дзейнасці ў сферы культуры прадугледжвала распрацаваная ў 2004 г. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна–эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. У якасці галоўнай мэты развіцця культуры да 2010 г. было вызначана развіццё і ўмацаванне інфраструктуры галіны для забеспячэння доступу жыхароў да культурных даброт і інфармацыйных рэсурсаў. У гэты перыяд павінна была сфарміравацца сістэма маніторынгу дзейнічаючых дзяржаўных праграм. Сярод канкрэтных мер побач з ужо не раз запісанымі ў папярэдніх дакументах такімі, як захаванне дзейнічаючай сеткі ўстаноў культуры і мастацтва і якаснае яе ўдасканаленне; умацаванне і абнаўленне матэрыяльна–тэхнічнай базы; захаванне рухомай і нерухомай культурнай спадчыны, былі і новыя. Сярод іх: стварэнне новых культурных аб’ектаў, здольных больш гнутка рэагаваць на змены ў патрэбнасцях і запыты насельніцтва; стварэнне банку даных аб гісторыка–культурнай спадчыне Беларусі, народнаму мастацтву і рамёствах; развіццё прафесійнай творчасці і прафесійнай мастацкай адукацыі, народных промыслаў і традыцыйнай культуры; павышэнне ўзроўню і якасці паслуг.

У працяг рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры у 2006 г. была падрыхтавана Галіновая праграма “Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.”, (зацверджана калегіяй Міністэрства культуры 30 мая 2006 г. № 40). Яе змест цалкам адпавядае адпаведнаму раздзелу Праграмы сацыяльна–эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гг. і вызначаецца значнай увагай да праблем сяла.

Стратэгічнай мэтай на новае пяцігоддзе было вызначана захаванне гісторыка–культурнай спадчыны, стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы, росту яе творчай ініцыятывы, духоўных і эстэтычных патрэбнасцей. Гэта павінна было значна павысіць ролю асобы як галоўнай рухаючай сілы новага постіндустрыяльнага грамадства. Для дасягнення гэтай мэты прадугледжвалася вырашэнне задач па забеспячэнню даступнасці культурных каштоўнасцей і пас-

ПолесГУ

луг, павышэнне іх узроўню і якасці, павелічэнне аб’ёмаў для жыхароў сяла, паляпшэнне культурнага абслугоўвання аддаленых вёсак; рэалізацыі праграмы рэстаўрацыі, рэканструкцыі і захавання прыярытэтных гісторыка–культурных каштоўнасцей беларускага народа, уключэнне іх у культурны і турыстычны абарот; вызначэнне і аднаўленне ў рэгіёнах краіны найбольш значных сельскіх гістарычных сядзіб з мэтай выкарыстання ў якасці аб’ектаў культурна–дасугавай дзейнасці; распрацоўцы і ўкараненню рацыянальнай сістэмы размяшчэння сельскіх устаноў культуры; забеспячэнню рэалізацыі кадравай палітыкі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў культуры і мастацтва на аснове ўкаранення новых адукацыйных тэхналогій; стварэнню пры сярэдніх спецыяльных навучальных установах культуры і мастацтва ў абласных гарадах кансультацыйных цэнтраў для аказання метадычнай дапамогі і выяўлення на сяле адораных дзяцей і таленавітай моладзі.

Як можна заўважыць, пералічаныя задачы на 2006–2010 гг. цалкам адпавядалі прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры, якія былі заканадаўча замацаваны яшчэ ў 1991 г. На жаль, сярод іх не знайшлося месца для задач, накіраваных на захаванне, развіццё і распаўсюджанне нацыянальнай мовы (новае палажэнне рэдакцыі Закона “Аб культуры” 2004 г.), а таксама стварэнне, распаўсюджанне і папулярызацыю твораў мастацкай літаратуры і мастацтва для дзяцей і моладзі.

Такім чынам, на працягу вывучаемага перыяду асноўныя мэты дзяржавы ў галіне культуры ў вывучаемы перыяд істотна не змяніліся. Яны былі накіраваны на рэалізацыю правоў грамадзян у галіне культуры, забеспячэнне ідэалагічнай і палітычнай незалежнасці культуры, свабоду творчасці, фінансавую і матэрыяльную падтрымку культуры і сацыяльную абарону яе работнікаў, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя. Пры гэтым асноўныя прыярытэтныя напрамкі рэалізацыі дадзеных мэтаў на працягу дваццацігадовага перыяду карэкціраваліся пад уздзеяннем сацыяльна–эканамічных працэсаў.